# Устойлівая сельская гаспадарка

У Беларусі склалася неэфектыўная сістэма кіравання сельскай гаспадаркай. Дзяржава валодае зямлёй, стварае так званыя "сыравінныя зоны" закупак для прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, вызначае закупачныя цэны на прадукцыю, з-за чаго практычна не развіваецца рыначная канкурэнцыя, расце колькасць стратных гаспадарак.

У жывёлагадоўлі пераважаюць буйныя экспартна-арыентаваныя таварныя комплексы, тэхналогіі на якіх прадугледжваюць выкарыстанне антыбіётыкаў і гармонаў, з'яўляюцца магутнымі крыніцамі забруджвання навакольнага асяроддзя. Інтэнсіўнае земляробства вядзецца з ужываннем вялікай колькасці хімічных угнаенняў і пестыцыдаў, што прыводзіць да забруджвання паверхневых і падземных вод.

*- Асушальная меліярацыя парушыла натуральныя экасістэмы, прывяла да зніжэння ўзроўню грунтавых вод, рэк і азёр.*

*- Ворнае земляробства на былых тарфянішчах прыводзіць да збяднення і апустыньвання глеб.*



*Фота: Антрапагенная пустыня ў Рэчыцкім р-не.*

### *Прычыны рэфармаваць сельскую гаспадарку Беларусі:*

1. **Сельская гаспадарка адказная за 20% усіх выкідаў** <u>$CO_2$</u> і яшчэ больш небяспечнага метану, якія выклікаюць змяненне клімату і яго наступствы – засухі, ураганы, паводкі, нашэсці шкоднікаў. У Беларусі пад пагрозай ветравой і воднай эрозіі знаходзяцца каля 1,5 млн. га, або 18% усіх сельскагаспадарчых земель.
2. **Дзяржава бюджэтнымі датацыямі падтрымлівае існую мадэль сельскай гаспадаркі**, а значыць <u>беларусы ў выглядзе падаткаў вымушана плаціць за нітраты ў агародніне, антыбіётыкі ў малацэ і мясе, забруджванне вадаёмаў, глеб і паветра</u>. Пры гэтым у абсалютнай большасці сельгаспрадпрыемствы застаюцца стратнымі з-за неэфектыўнага кіравання, састарэлай тэхнікі, нерацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, а заробкі складаюць менш як 69% ад сярэдніх па рэспубліцы**.**
3. **У Беларусі паводле стану на 2023 г. было ўсяго 26 арганічных гаспадарак,** якія выкарыстоўваюць 1600 га зямлі. Галоўныя складанасці са словаў фермераў – гэта <u>недахоп зямлі</u> і рызыка яе канфіскацыі, складанасць са збытам прадукцыі, дарагая сертыфікацыя, патрэба ачысткі зямлі ад цяжкіх металаў, пестыцыдаў, мінеральных угнаенняў.

- ***Арганічнае земляробства*** *пазітыўна ўплывае на абарону прыроды: захоўвае біяразнастайнасць, глебы, забяспечвае якасць падземных і паверхневых вод; прадукцыя не змяшчае небяспечных для здароўя чалавека кампанентаў.*

**- Арганічная жывёлагадоўля** ўлічвае фізіялагічныя і паводзінныя запатрабаванні жывёл: не дапушчаецца выкарыстанне ГМА, антыбіётыкаў, гарманальных прэпаратаў, прымусовага кармлення, заахвочваецца вольны выпас і мясцовыя кормы.

Сельская гаспадарка паўпрост залежыць ад стану навакольнага асяроддзя і клімату, пры гэтым наносіць ім найбольшыя страты. Зялёная эканоміка накіраваная на эфектыўнае развіццё рэсурсаў і экалагічную вытворчасць, якія не шкодзяць навакольнаму асяроддзю.

### *Карысць для беларусаў*

Першым чынам, гэта смачныя і бяспечныя прадукты для нас і нашых дзяцей, здаровае навакольнае асяроддзе. Гэта новыя працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці, развіццё перапрацоўкі адходаў, сельскага будаўніцтва, зялёнай энергетыкі.

Прыватная ініцыятыва дапаможа развіваць агратурызм, забяспечваючы дадатковы даход для сельскіх жыхароў і павышаючы прывабнасць беларускай вёскі. Стварэнне новых працоўных месцаў і развіццё сельскай эканомікі дапаможа спыніць адток людзей з вёсак, палепшыць сацыяльную, транспартную інфраструктуру.

## Як зрабіць сельскую гаспадарку Беларусі больш устойлівай?

Улічваючы страты ад традыцыйнай сельскай гаспадаркі і ўсё большыпопыт на арганічныя прадукты, Беларусі неабходна развіваць фермерства і асабістыя падсобныя гаспадаркі – больш экалагічныя ў параўнанні з цяпер існымі буйнымі гаспадаркамі.

Неабходнымі ўмовамі для развіцця фермерства з'яўляюцца **прыватная ўласнасць на зямлю**, што дасць магчымасць інвеставаць у вытворчасць, тэхніку, новыя метады гаспадарання і роўны доступ да фінансавання і рынкаў збыту.

| Мэта | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Падтрымліваць арганічнае земляробства і жывёлагадоўлю** | |
| **Развіццё арганічнай сельскай гаспадаркі,** якая ўжо даказала сваю эфектыўнасць у Беларусі, а яе прадукцыя запатрабаваная ў Беларусі і на рынках ЕС | - Дазволіць прыватную ўласнасць на зямлю<br>- Прывесці заканадаўства ў адпаведнасць са стандартамі ЕС, стварыць сістэму сертыфікацыі<br>- Укараніць зялёныя дзяржаўныя закупкі<br>- Стварыць умовы для развіцця экспарту<br>- Падтрымліваць асацыяцыі арганічных фермераў<br>- Развіваць аграрную адукацыю і навуку |
| **2. Экалягізаваць сельскую гаспадарку** | |
| **Зрабіць больш экалагічнай і біядынімічнай усю сельскую гаспадарку**, бо з-за асаблівасцей клімату арганічнае земляробства не зможа забяспечыць усе патрэбнасці Беларусі | - Граматна выкарыстоўваць угнаенні і сродкі аховы раслін<br>- Аднаўляць дэградаваныя землі<br>- Абмежаваць ворнае земляробства на тарфянішчах<br>- Збалансаваць структуру жывёлагадоўлі<br>- Развіваць развядзенне рыбы, збор грыбоў, ягад, лекавых траваў |
| **3. Выраблць біягаз і ўгнаенні з адходаў** | |
| Ператварыць адходы земляробства і жывёлагадоўлі з "забруджвальнікаў" глеб і вады ў рэсурс для біягазавай энергетыкі і спосаб **павысіць рэнтабельнасць гаспадарак** | - Перапрацоўваць гной у біягаз і экалагічнае ўгнаенне, для зніжэння выкіду метану і CO2<br>- Выраблць з арганічных адходаў цяпло і электрычнасць для патрэб гаспадаркі і продажу<br>- Укараняць с\х тэхніку на біягазе для скарачэння выдаткаў на паліва і ГЗМ. |

*- Штогод у Беларусі ўтвараецца 89 млн. т. арганічных адходаў, з якіх выкарыстоўваецца толькі 2%. 3 тонны гною можна атрымаць 30-65 м³ біягазу і 200 кг угнаенняў.*

*- Паводле ацэнкі кампаніі ALC Eneka, у Беларусі можна пабудаваць 982 біягазавыя комплексы магутнасцю 670 МВт.*

### *Крыніцы фінансавання рэформ*

Пасля аднаўлення дэмакратыі і законнасці ў краіне, Беларусь атрымае доступ да сродкаў Плана эканамічнай дапамогі ЕС, крэдытаў і грантаў ЕІБ, ЕБРР, МВФ, праграм тэхнічнай і матэрыяльнай дапамогі, замежных і ўнутраных інвестыцый.

Дзяржава павінна адыходзіць ад прамога субсідавання стратных гаспадарак, ствараючы замест гэтага стымулы ў выглядзе падатковых ільгот, развіваючы зялёнае фінансаванне і зялёныя дзяржаўныя закупкі.

Нават у цяперашніх умовах фермерства ў Беларусі з'яўляецца выгадным бізнесам. Праекты па перапрацоўцы адходаў, вытворчасці біягазу, зялёнай энергетыкі, укладанні ў сучасную тэхніку і новыя тэхналогіі акупляюцца ў сярэднім за 5-12 гадоў і значна павышаюць прадукцыйнасць.

*Аўтары: Аляксандра Мамаева ў супрацы з беларускім экспертам*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*